Урок беларускай мовы ў 5 «В» класе.

Тэма: “Вымаўленне і правапіс галосных е, ё, я”.

Мэта: стварыць умовы для ўзнаўлення і пашырэння ведаў вучняў аб вымаўленні і правапісе галосных е, ё, я; сайдзейнічаць развіццю ўмення вызначаць націскны, пераднаціскны і паслянаціскны склады; фарміраваць культуру індывідуальнай і калектыўнай вучэбнай дзейнасці.

Тып урока: урок вывучэння новага матэрыялу.

Абсталяванне: мультымедыйны праектар, карткі з тэкстам, тлумачальныя слоўнікі .

Эпіграф да ўрока: О, край родны, край прыгожы!

Мілы кут маіх дз_доў,

Што мілей у свеце божым

Гэтых светлых б_рагоў,

Дзе бруяцца срэбрам рэчкі,

Дзе бары-л_сы гудуць,

Дзе м_дамі пахнуць грэчкі,

Нівы гутаркі вядуць….

Я. Колас

Ход урока

1. <u>Арганізацыйны момант</u>.

Добры дзень, шаноўныя! Сёння такі прыгожы сонечны дзень і я хачу, каб у вас быў такі ж цудоўны сонечны настрой. Не забывайце, што добры настрой – гэта палова поспеху і перамогі. Таму ўсміхніцеся і прывітайце адзін аднаго. Жадаю вам сёння атрымаць на ўроку перамогу ў барацьбе за веды.

2. <u>Праверка дамашняга задання</u>.

Настаўнік. А зараз паглядзіце, як вам усміхаецца сонейка (на дошцы). Яно хоча нагадаць вам аб тым, пра што вы даведаліся на папярэднім уроку.

Настаўнік. Каб успомніць, што мы вывучалі на папярэднім уроку, трэба адказаць на пытанні, якія напісаны на праменьчыках сонейка.

1. Як вымаўляюцца гукі [о], [э] пад націскам? Якімі літарамі яны

абазначаюцца на пісьме?

2. Які гук вымаўляецца не пад націскам на месцы гукаў [о], [э]? Якая

літара пішацца замест літар о, э не пад націскам?

3. Калі вымаўляецца гук [э] і перадаецца на пісьме літарай э

незалежна ад націску? Прывядзіце прыклады.

Настаўнік. А каб праверыць правільнасць выканання дамашняга практыкавання, прапаную вам арфаграфічную размінку.

Прыём «Літары гуляюць у хованкі». (Настаўнік кідае вучню мяч, называючы пэўнае слова з дамашняга практыкавання, у якім трэба было ўставіць прапушчаную літару **а, о, э**, а вучні павінны, каму напраўлены мяч, адказаць, якая літара была “схавана” і прагаварыць правіла.

<u>3.Падрыхтоўка да ўспрымання тэмы.</u>

Настаўнік. Гэты ўрок мне хочацца прысвяціць самаму дарагому, што ёсць у кожнага з нас – нашай Радзіме, нашаму роднаму краю. Дзе б мы з вамі ні былі, нам хочацца хутчэй вярнуцца ў бацькоўскую хату, у родную вёску. Давайце звернемся да эпіграфа ўрока (зачытваецца верш).

- А як вы адносіцеся да свайго роднага краю?
- Што вы лічыце галоўным у вашым жыцці?

Настаўнік. Вашы пачуцці сугучныя з пачуццямі аўтара, значыць нездарма мы выкарысталі гэтыя радкі ў якасці эпіграфа да ўрока. Прачытайце ў тлумачальным слоўніку значэнне слова "эпіграф" і запомніце яго. (Эпіграф – цытата, якая змяшчаецца ў пачатку твора ці асобнага раздзела і выражае асноўную ідэю твора). На працягу ўрока мы будзем звяртацца да тэмы нашай Бацькаўшчыны.

4. Праца з тэкстам эпіграфа. Вызначэнне тэмы ўрока, пастаноўка задач:

1. Устаўце прапушчаныя літары ў радках эпіграфа і растлумачце іх правапіс.
2. На якую тэму прапушчаны арфаграмы? (На правапіс **е, ё, я**)

Настаўнік. Гэта і будзе тэмай нашага ўрока: "Вымаўленне і правапіс галосных е, ё, я". (Запіс тэмы ў сшытках).

Карыстаючыся словамі, якія запісаны на дошцы давайце паставім задачы сёняшнягаўрока. (На дошцы запісаны апорныя словы, вучні дапамагаюць настаўніку прадоўжыць фразы: узнавіць, паглыбіць, умець, выхоўваць.)

5. Актуалізацыя апорных ведаў.

Работа з падручнікам. Практыкаванне 63.

-Калі у слове пісацца літара ё?

-У якім складзе перад націска замест літары ё,е пішацца літара я. (Адказы вучняў)

6. Інфармацыйна-пошукавы этап.

Праца з тэкстам правіла на с.31,3. Прачытайце правіла. Зрабіце алоўкам паметкі ў падручніку:

"+" – я гэта ведаю; "!" – я даведаўся новае.

Тлумачэнне новага матэрыялу па алгарытму (на слайдзе):

**ПРАВАПІС ГАЛОСНЫХ Е,Ё,Я**

<table>
<tr><td colspan="2">1. Пастаў націск<br>2. Падзялі на склады</td></tr>
<tr><td colspan="2">Літара ё = пад націскам (вёска, лёс).<br>Акрамя слоў з коранем ёд, ёт (ёдаформ, ётавы) і слова радыё.</td></tr>
<tr><td>Калі<br>першы склад перад націскам,<br>пішы Я (АЛЕ!<br>Пасля Г, К, Х + е<br>( кефір, герой, кераміка…,<br>у запазычаных словах + е<br>(легенда, абеліск, медаль ...)</td><td>Калі<br>любы другі склад = пішы Е<br>АЛЕ!<br>Я каранёвае (сувязь, заяц, месяц, памяць …)<br>Я ў суфіксах<br>(дробязь, веялка, сеяць …)</td></tr>
</table>

7. Трэніровачна-карэкцыйны этап.

Работа з падручнікам. Практыкаванне 66 Напішыце словы па-беларуску і пастаўце націск. Растлумачце правапіс е, я (вучні выходзяць па чарзе да дошкі і выконваюць заданне).

Прыём “Рэшата”. На мультымедыйнай дошцы запісаны словы, у якіх неабходна ўставіць літару е ці я. Словы з літарай я, устаўленай замест кропак, запішыце ў левы слупок, а з літарай е – у правы. Хто “прасее” словы хутчэй і без памылак, той і пераможа (пасля выканання прапаную выканаць узаемаправерку: абмяняцца сшыткамі і зверыць правільны варыянт, напісаны на наступным слайдзе).

8. Фізкультхвілінка.

Настаўнік. Калі я буду называць запазычаныя словы, вы павінны прысядаць, а калі я буду называць спрадвечнабеларускія словы, вы павінны паднімаць рукі ўверх.

9. Замацаванне.

Мы нездарма загаварылі з вамі пра запазычаныя словы, бо іх напісанне вызначаецца па арфаграфічным слоўніку. Зараз я прапаную вам завучыць вось такую рыфмаванку, каб пісаць запазычаныя словы без памылак:

Герой, медаль, пенал, зефір,

бензін, педаль, гепард, кефір,

секунда, бегемот, бетон,

берэт, легенда, фельетон,

герань, феномен, вазелін,

гектар, сеанс і апельсін.

Прыём “Пятае лішняе”: ап_льсін, б_нзін, пал_шук,  г_рань, п_йзаж. (Паляшук.)

- Чаму слова паляшук – “пятае лішняе”?
- Хто такі паляшук? (Пасля адказаў вучня прапаную звярнуцца да тлумачальнага слоўніка і зачытаць азначэнне)

Работа з тэкстам.

Прыём  “Карэктар”. (У кожнага вучня на парце картка з тэкстам). У тэксце 6 памылак на правапіс галосных е, ё, я. Знайдзіце словы з памылкамі, і патлумачце правапіс гэтых слоў графічна).

Беларусь! Цікавы і няпаўторны край, край мужнага і працавітага народа, гасціннага і шчырага…

Тэрыторыя нашай рэспублікі пераважна раўнінная, перасечаная невысокімі ўзгоркамі, пакрытая лесной і травіной расліннасцю. Няма тут ні мора, ні высокіх гор, ні безмежных стэпаў, ні песчаных пустынь. Але нямала тут цудоўных куткоў, якія пакідаюць незабыўны след у памеці тых, хто жыве ў гэтым краі, хто наведвае яго ў якасці госця.

- Вызначце тэму тэксту, яго асноўную думку, дайце назву.
- Ці можна сказаць, што аўтар гэтага тэксту любіць сваю Радзіму?

Заданне 1.

Індывідуальнае заданне каля дошкі: уставіць прапушчаныя літары, зрабіць сінтаксічны разбор сказа.

Заданне 2.

Заданні па варыянтах:

Заданне 1. Знайдзіце ў апошнім сказе тэксту словы, у якіх літары е, ё, я абазначаюць 2 гукі, затранскрыбіруйце гэтыя словы (праверым з адказамі на мультымедыйным экране).

Заданне 3.

Творчае заданне. Запісаць 3-4 сказаў на тэму “Я люблю свой родны край”.

Настаўнік. Паслухаем “творцаў”. Знайсці ў паведамленнях словы, якія адносяцца да нашага правіла.

10. Дамашняе заданне. Практыкаванне 264.

11. Падвядзенне вынікаў.

- Над якой тэмай мы сёння працавалі?

- Калі ў словах пішацца літара **я**, а калі літара **е**?
- У словах пасля г, к, х, якую літару будзем пісаць е або я?

Прывядзіце прыклад.

- У запазычаных  словах якую літару будзем пісаць **е** або **я**?

Прывядзіце прыклад

12. Рэфлексія.

- Ці спадабаўся вам сёняшні  ўрок?
- Што далося вам цяжэй?
- Якія заданні былі больш займальныя?
- Які настрой у вас пасля работы на ўроку? Ацаніце яго ў балах.